## Электронны бюлетэнь: ЛГБТК+ у Беларусі

*01-03.2024 г.*

**ЗМЕСТ:**


1. Становішча беларускай ЛГБТК+ супольнасці
2. Асвятленне ЛГБТК+ тэматыкі ў беларускіх масмедыя
3. Навіны Праваабарончай ініцыятывы “Журналісты за талерантнасць” (J4t) / Gpress.info


### 1. СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСКАЙ ЛГБТК+ СУПОЛЬНАСЦІ

Пачатак 2024 года прынёс новыя рызыкі крымінальнага пераследу і зацкоўвання на дзяржаўным узроўні не толькі для беларускіх квір-актывістаў, але і для кожнага прадстаўніка ЛГБТК-супольнасці Беларусі.

***Беларускі квір-рэсурс прызнаны “экстрэмісцкім”***

Рашэннем суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 28 сакавіка 2024 года Інтэрнэт-рэсурс беларускай грамадскай ініцыятывы па падтрымцы трансгендарных асобаў “TG-HOUSE” быў прызнаны “экстрэмісцкім” разам з яе сацсеткамі і нават лагатыпам. Гэта першы прэцэдэнт, калі квір-рэсурс прызнаны “экстрэмісцкім” у Рэспубліцы Беларусь.

| | | |
|---|---|---|
| | | процессуального кодекса |
| Информационная продукция | Интернет-ресурс с названием "TG HOUSE", имеющий идентификатор https://www.tghouse.org, его аналоги в социальных сетях: https://www.facebook.com/groups/2722007911212975; https://www.facebook.com/groups/2722007911212975/user/100087860432855/; https://www.instagram.com/tghouseby/; https://vk.com/clubl91148648?t2fs=ffefd158d082d9666f_3; Telegram-канал с названием "Tg House Belarus", имеющий идентификатор https://t.me/tghouseby и идентификатор (id), содержащий последовательность цифр 1001244820712, привязанный к нему чат с названием "Tg House Chat", идентификатор (id), содержащий последовательность цифр 1001256361507; логотип (водяной знак) в виде дома и двух латинских букв "T" и "G" зеленого цвета. | Решение суда Центрального района г.Минска от 28 марта 2024 года. Подлежит немедленному исполнению в соответствии с 314 статьей Гражданского процессуального кодекса |

Паводле артыкула 19.11 КаАП Беларусі за распаўсюд або захоўванне з мэтай распаўсюду “экстрэмісцкіх матэрыялаў” у Беларусі пагражае адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу або арышту з канфіскацыяй “сродку злачынства” (тэлефон, ноўтбук і г. д.).

***Міністэрства культуры Беларусі атаясаміла ЛГБТК+ і парнаграфію***

Паводле пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь №24 ад 19 сакавіка 2024 года у паняцце “парнаграфіі” былі ўнесеныя “нетрадыцыйныя полавыя адносіны і (ці) полавыя паводзіны”**.** Сярод іншага, у дадзенае паняцце чыноўнікамі былі ўключаныя полавыя адносіны паміж:

- людзямі аднога полу (гомасексуалізм, лесбійскае каханне);
- адной асобы з людзямі розных палоў (бісексуальныя адносіны);
- адной асобы адначасова з некалькімі людзямі аднаго або розных палоў (поліяморыя);
- надзяванне вопраткі супрацьлеглага полу галоўным чынам дзеля таго, каб дасягнуць полавага ўзбуджэння і выклікаць вобраз індывіда процілеглага полу (фетышысцкі трансвестызм);
- жаданне жыць і ўспрымацца навакольнымі як асоба процілеглага полу... (транссексуалізм).

У гэтым жа спісе сярод парнаграфічных “нетрадыцыйных полавых адносінаў і (ці) полавых паводзінаў” узгадваюцца заафілія, некрафілія і педафілія.

Публічнае дэманстраванне парнаграфічных матэрыялаў караецца ў Беларусі пазбаўленнем волі да чатырох год, а з выявай непаўнагадовага – на тэрмін да 13 год.

### *Анансаваны адміністрацыйны пераслед за пашырэнне інфармацыі пра ЛГБТК+*

*19 лютага 2024 года* генпракурор Рэспублікі Беларусь Швед паведаміў пра распрацоўку зменаў у Кодэкс адміністрацыйных правапарушэнняў, паводле якіх будзе прадугледжанае пакаранне за “прапаганду нетрадыцыйных адносінаў, змены полу і добраахвотнай адмовы ад нараджэння дзяцей”.

Сярод іншага, праўладны рэжым плануе ўнесці наступныя артыкулы ў КаАП Беларусі:

“наўмысны распаўсюд у любой форме інфармацыі ў мэтах фарміравання ў індывідуальна-неакрэсленага кола асобаў прывабнасці гомасексуальных адносінаў або змены полу” – штраф за парушэнне – да 20 базавых велічыняў для фізасобаў, да 100 базавых для ІП і да 150 базавых для юрасобаў.

У выпадку “прапаганды” сярод непаўнагадовых, санкцыі будуць больш сур’ёзныя: да 30 базавых, грамадскія працы або арышт для фізасобаў, да 150 базавых для ІП і да 200 – для юрасобаў.

### *Трансгендарным людзям адмаўляюць у карэкцыі полу*

Паводле беларускай транс-актывісткі Алісы Сармант, на Міжведамственую камісію па медыка-псіхалагічнай і сацыяльнай рэабілітацыі людзей з сіндромам адмаўлення полу пры РНПЦ псіхічнага здароўя аказваецца ціск. За апошні год заўважна зменшылася колькасць дазволаў на змену полу, якую выдае РНПЦ. У 2023 годзе 70% заяваў былі адкінутыя. Падчас другога паседжання камісіі ў 2023 годзе ўзяла ўдзел усяго адна асоба. Як высветлілася, выдадзены раней гэтай асобе дазвол на карэкцыю полу падчас гэтага паседжання быў ануляваны. У 2024 годзе камісія пакуль не збіралася.

### *Працяг цкавання ЛГБТК+ людзей у СМІ, сацыяльных сетках і месэнджарах*

*Паводле паведамленняў праваабаронцаў, 3 лютага 2024 года* беларускія прапагандыскія тэлеграм-каналы распаўсюдзілі чарговае паведамленне пра затрыманне прадстаўніцы ЛГБТК-супольнасці, трансгендарнай асобы Т. Апублікаванае “пакаяннае відэа” суправаджалася выявамі псіхалагічнага гвалту, цкавання, дыскрымінацыйнымі выказваннямі, мовай варожасці і заклікамі забараніць карэкцыю полу ў краіне. Былі раскрытыя персанальныя дадзеныя трансгендарнай асобы, медычныя дэталі аперацыі, дэманстраваліся фота аголенага цела з геніталіямі.

Палітычныя аналітыкі адзначаюць, што падобнае мэтанакіраванае цкаванне пэўнай уразлівай супольнасці і ўмяшальніцтва ў прыватнае жыццё грамадзян – індыкатар руху дзяржавы ў бок таталітарызму.

Аналіз наратываў беларускіх масмедыя ў рамках маніторынгавага даследавання J4t у 2023 годзе паказаў, што прыкладна кожная другая публікацыя на тэму ЛГБТК+ у беларускіх медыя ўтрымлівае праявы мовы варожасці. Часцей за ўсё гэта або абвінавачванні ў адмоўным ўплыве на грамадства, або ўзгадванне ЛГБТК+ для дыскрэдытавання палітычных праціўнікаў.

## 2. АСВЯТЛЕННЕ ЛГБТК+ ТЭМАТЫКІ Ў БЕЛАРУСКІХ МАСМЕДЫЯ

У першым квартале 2024 года тэматыка ЛГБТК+ з'яўлялася даволі рэдка як у незалежных, так і дзяржаўных беларускіх грамадска-палітычных масмедыя. На жаль, гісторыі супольнасці і надзённыя выклікі супольнасці асвятляліся ў асноўным у нешматлікіх нішавых медыях. Сітуацыя нагадвала "зацішша перад бурай".

У асноўным, гэта было рэагаванне на заканадаўчыя навацыі і выказванні чыноўнікаў па ўвядзенні адміністрацыйнай адказнасці за "прапаганду нетрадыцыйных адносінаў, змены полу і добраахвотнай адмовы ад нараджэння дзяцей".

Незалежныя медыя пры гэтым выказвалі спагаду ЛГБТК+ супольнасці, якую дзяржава спрабуе паставіць у адзін шэраг з педафіламі і іншымі крымінальнымі злачынцамі, і нязгоду з парушэннем падставовых правоў чалавека і далейшай стыгматызацыяй беларускай квір-супольнасці:

*Анлайн-выданне CityDog:* «Замест таго, каб ствараць умовы для нараджэння дзяцей, аб'яўляюць ворагамі ЛГБТ і чайлдфры». Эксперткa – пра тое, чаму людзі вераць беларускай прапагандзе
Дзяржаўныя і прадзяржаўныя СМІ рыхтавалі грамадскую думку дзеля шальмавання і яшчэ большай дэманізацыі ЛГБТК-людзей пасля чаканага ўвядзення санкцыяў за "прапаганду нетрадыцыйных адносінаў". У некаторых выпадках ЛГБТ-супольнасць наўпрост прадстаўлялася ў дзяржаўных СМІ ворагамі і "разбуральнікамі" дзяржавы:

*Агенцыя навінаў БелТА:* Чемоданова о выставке БЕЛТА: ЛГБТ в Минске и нападения на милицию - это не должно повториться

*Тэлекампанія АНТ:* В Беларуси введут ответственность за пропаганду нетрадиционных отношений

## 3. НАВІНЫ І АБВЕСТКІ J4t / GPRESS.INFO

***Даследаванне патрэбаў мэтавых групаў J4t***

Каб лепш зразумець, на што арыентаваць асноўныя напрамкі дзейнасці Праваабарончай ініцыятывы “Журналісты за талерантнасць”, каманда J4t правяла даследаванне сярод прадстаўнікоў асноўных мэтавых групаў – беларускіх журналістаў_ак і рэдактараў_ак.

Звычайны дзень для рэспандэнтаў, якія працуюць у медыйным сектары, звязаны з рэгулярнайператамленнем і прафесійнымі абавязкамі ў выхадныя. Гэта суправаджаецца гнуткім графікам, што ўскладняе планаванне загадзя і аддзяленне працы ад асабістага жыцця.

75% паведамляюць пра прафесійнае выгаранне, 62% адчуваюць сябе абмежаванымі ў тэмах, якія яны могуць ахапіць, 56% сутыкаюцца з фінансавымі праблемамі, а 53% з цяжкасцю знаходзяць прадметы і экспертаў для сваіх журналісцкіх матэрыялаў.

Праблемы ў асвятленні тэматыкі ўразлівых груп ўключаюць:

- ананімнасць суб'ектаў;

- нежаданне суб’ектаў выказвацца, нават ананімна;

- усведамленне рызык і цяжкасці ў ініцыяванні першаснага кантакту (крымінальная адказнасць за кантакты са СМІ, прызнаным “экстрэмісцкім”, робіцца сур’ёзным бар’ерам для ўсталявання кантакту з патэнцыйнымі героямі публікацыяў.

На пытанне, чым можа быць карысная ініцыятыва J4t, рэспандэнты адказалі наступнае:

- асветніцкія праекты (выданні аб асаблівасцях асвятлення ўразлівых групаў);

- камунікацыйныя праекты (падтрымка сувязяў паміж журналістамі і рэдактарамі сацыяльных медыяў);

- прававая абарона (асабліва ЛГБТК-журналістаў);

- факусаванне на каштоўнасцях (нагадванне журналістам і рэдактарам аб істотных выкліках уразлівых групаў, якія могуць застацца без увагі).

***Пяты Летнік разнастайнасці J4t***

На пачатку траўня 2024 года ў Грузіі адбыўся *Пяты Летнік разнастайнасці для журналістаў_ак, рэдактараў_ак, пісьменнікаў_ц і квір-актывістаў_к.*

Удзельнікі практыка-арыентаванага курсу пазнаёміліся з канцэпцыяй правоў чалавека і скразнымі каштоўнасцямі. Навучаліся распазнаваць ўласную ксенафобію і пазбаўляцца яе, выпрацоўваючы талерантнасць да ўразлівых групаў.

Акрамя гэтага, удзельнікі Летніка атрымалі веды па тэме мовы варожасці і недыскрымінацыі і практычныя парады па тым, як зрабіць сваю мову больш інклюзіўнай.

Мяркуецца, што атрыманыя веды будуць пашырацца імі ў прафесійным асяроддзі і выкарыстоўвацца разам з інклюзіўнымі практыкамі ў працоўнай дзейнасці.

***Развіццё [Gpress.info]***

У цяперашні час рэдакцыя ***Gpress.info*** ставіць сабе на мэце пашыраць беларускую аўдыторыю. Асаблівая ўвага будзе надавацца той частцы аўдыторыі, якая застаецца ў краіне дзеля іх псіхалагічнай падтрымкі, навінавага суправаджэння па тэмах, якія рэлевантныя для квір-супольнасці, фарміравання сярод супольнасці прадэмакратычных каштоўнасцяў, надавання інфармацыі пра адукацыю за мяжой і магчымасці эміграцыі / эвакуацыі з краіны.

***Gpress.info*** ў сацыяльных сетках:

YouTube

TikTok

Telegram

Facebook

Instagram

УКантакце

Twitter

E-mail: gaypresseu@gmail.com

**©Праваабарончая ініцыятыва “Журналісты за талерантнасць”, 2024**

*Спасылка на Праваабарончую ініцыятыву “Журналісты за талерантнасць” при выкарыстанні матэрыялаў Электроннага бюлетэня “ЛГБТК+ у Беларусі” з’яўляецца абавязковай.*